***Шилова Е. С.**, кандидат педагогических наук, доцент кафедры менеджмента и образовательных технологий факультета управления и профессионального развития педагогов ИПКиП БГПУ*

# Учимся вместе

С 2014 года установилось тесное сотрудничество факультета управления и профессионального развития педагогов (декан О. В. Клезович), кафедры менеджмента и образовательных технологий (заведующий Ю. Н. Кислякова) Института повышения квалификации и переподготовки Белорусского государственного педагогического университета имени Максима Танка (директор И. В. Шеститко) и ГУО «Гимназия г. Ляховичи» (директор Т. А. Шибун).

В 2015 году преподаватели кафедры менеджмента и образовательных технологий являлись научными руководителями по подготовке квалификационных работ на сдачу экзамена на подтверждение высшей категории следующих учителей начальных классов гимназии:

- Н. Л. Яцушко по теме «Развитие младших школьников на уроках обучения грамоте — основа успешного обучения», научный руководитель — Е. С. Шилова;
- И. К. Сасимчик по теме «Использование приёма антиципации на уроках литературного чтения», научный руководитель — Е. С. Шилова;
- Н. М. Прончак по теме «Система работы над словами с непроверяемыми орфограммами на уроках русского языка в начальных классах», научный руководитель — Е. С. Шилова;
- Л. С. Слива по теме «Формирование орфографической зоркости учащихся при изучении темы «Безударные гласные в корне слова», научный руководитель — Е. С. Шилова;
- Н. В. Ксенжик по теме «Развитие языкового анализа и синтеза в системе речевого развития школьника», научный руководитель — О. В. Клезович;
- И. Б. Семченко по теме «Обучение грамоте — первоначальный и важный этап формирования орфографической зоркости», научный руководитель — О. В. Клезович;
- Н. В. Климова по теме «Использование метода "звукового ориентира"» при обучении чтению, научный руководитель — О. В. Клезович;
- Е. В. Черняк по теме «Роль устного счёта в процессе формирования вычислительных навыков у младших школьников», научный руководитель — А. В. Маковчик.

С целью эффективного и взаимовыгодного социального партнёрства, содействия расширению информационного и делового сотрудничества 1 октября 2017 года был заключён Договор о сотрудничестве между ИПКиП БГПУ и ГУО «Гимназия г. Ляховичи».

Современный учитель нуждается в профессиональном сопровождении. С этой целью с 2017 г. преподавателями ИПКиП БГПУ Н. В. Быстряковой, Е. А. Земцовой, О. В. Клезович, М. В. Кудейко, И. А. Турченко, И. Б. Стрелковой, В. В. Радыгиной, Е. С. Шиловой в гимназии с учителями начальных классов проводятся обучающие курсы, практические семинары по следующим темам:

- «Интенсивные образовательные технологии на уроках в начальных классах»;
- «Интерактивная доска как средство обучения»;
- «Корпоративная культура и ценности учреждения образования»;
- «Формирование исследовательских компетенций педагогов и учащихся»;
- «Личностно ориентированное обучение и его роль в образовательном процессе»;
- «Особенности организации образовательного процесса на I ступени общего среднего образования на современном этапе».

Педагогический коллектив гимназии принимает активное участие в мероприятиях, проводимых ИПКиП:

– Международной научно-практической конференции на тему «Образование взрослых: управление личностным и профессиональным развитием» (Минск, 16–17 ноября 2017 г.);

– Международной научно-практической конференции на тему «Дополнительное образование взрослых: международные тенденции и национальные приоритеты» (Минск, 22–23 ноября 2019 г.).

Благодаря высочайшему профессионализму преподавателей ИПКиП учителя гимназии повышают уровень педагогического мастерства, совершенствуют умения моделировать и проектировать собственную педагогическую деятельность в направлении повышения её качества, учатся ориентироваться в информационном пространстве, обучаются в сотрудничестве, формируют и совершенствуют информационно-коммуникативную компетентность.

# Адкрыты ўрок «Мая Радзіма — Беларусь» у IV класе Людмілы Сцяпанаўны Слівы

(гімназія г. Ляхавічы)

**Тэма. Еўфрасіння Полацкая.**

***Мэта:*** плануецца, што вучні будуць ведаць асноўныя звесткі з жыцця і дзейнасці Еўфрасінні Полацкай.

***Задачы:***

- пазнаёміць вучняў з біяграфічнымі звесткамі Еўфрасінні Полацкай і раскрыць вялікую гуманістычную ролю яе служэння сваёй Бацькаўшчыне;
- развіваць камунікатыўныя здольнасці вучняў, навыкі групавога ўзаемадзеяння, аналітычныя здольнасці, уменні самакантролю, самаправеркі, самаацэнкі;
- выхоўваць высокія маральныя якасці ў вучняў, павагу да гісторыі і культуры Беларусі.

***Тып урока:*** камбінаваны.

***Абсталяванне:*** *Паноў, С. В.* Чалавек і свет. Мая Радзіма — Беларусь : вучэб. дапам. для 4-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / С. В. Паноў, С. В. Тарасаў. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2018. — 166 с.; *Тарасов, С. В.* Атлас «Человек и мир» : учеб. пособие для 4-го кл. общеобраз. учреждений с рус. яз. обучения / С. В. Тарасов, С. В. Панов, И. А. Гимпель, А. С. Малышева. — РУП «Белкартография», 2010. — 24 с.;

карткі для правядзення групавой работы; мультымедыйная прэзентацыя; буклет для гасцей.

**I. Арганізацыйны этап.**

***Настаўнік:*** Сёння ў нас урок «Мая Радзіма — Беларусь». Спадзяюся, што вам утульна і прыемна знаходзіцца ў нашым класе.

**II. Паэтычная хвілінка.**

***Настаўнік:*** Каб стварыць добры настрой, мы пачнём з паэтычнай хвілінкі і паслухаем верш Яніны Жабко пра нашу Радзіму. (Настаўнік вывешвае на дошцы ілюстрацыі васілька, буслоў, чаромхі, азёр, бяроз і да т. п., якія раскрываюць змест твора.)

Ты такі ненаглядны — мой радзімы
куточак зямлі.
Ты такі ненаглядны — край,
дзе крылы ўзнімаюць буслы,
Дзе асколачкам неба васілёк у мірным
полі цвіце
І ля кожнай хацінкі прыгажуня бяроза расце,
Край азёраў глыбокіх і чаромхавых
белых завей,
Ідэалаў высокіх, працавітых і шчырых людзей.

— Шмат пісьменнікаў усхвалялі нашу краіну ў вершах, апавяданнях і другіх мастацкіх творах. Падбярыце, калі ласка, і вы словы пра Беларусь. *Наша Беларусь светлая, чыстая, белая; шматнацыянальная; працавітая, мудрая; утульная, міралюбівая, чароўная; добразычлівая, дружалюбная; з блакітнымі вачыма, пад белымі крыламі...*

***Настаўнік:*** Малайцы! Вельмі прыемна слухаць такія пяшчотныя словы, гэта сведчыць аб тым, што ўсе мы любім нашу краіну, нашу Радзіму.

**III. Этап актуалізацыі суб'ектнага вопыту вучняў.**

**Праверка дамашняга задання.**

***Настаўнік:*** Зараз я прапаную вам выканаць тэст, каб праверыць дамашняе заданне.

Тэст для праверкі дамашняга задання.

*1. Пра каго гэтыя словы: «То ваўком, бывала, абернецца, то турам, то сокалам...»?*

А) Ізяслаў; Б) Яраслаў Мудры; В) Рагнеда; Г) Усяслаў Чарадзей.

*2. Усяслаў Чарадзей...*

А) унук Рагнеды; Б) унук Яраслава Мудрага; В) унук Ізяслава.

*3. Назаві горад, у якім княжыў Усяслаў Чарадзей.*

А) Полацк; Б) Мінск; В) Кіеў.

*4. Як называлася дзяржава, у якой княжыў Усяслаў Чарадзей?*

А) Кіеўская Русь; Б) Наўгародская зямля; В) Полацкае княства.

*5. Колькі гадоў было Усяславу, калі ён пачаў дружыну збіраць?*

А) 18; Б) 15; В) 16.

*6. Назаві раку, на якой адбылася бітва паміж Усяславам і Кіеўскімі князямі.*

А) Заходняя Дзвіна; Б) Сож; В) Дняпро; Г) Няміга.

*7. У якім годзе адбылася бітва на рацэ Нямізе?*

А) 862; Б) 1101; В) 1067.

*8. Дзе быў пабудаваны сабор па загадзе Усяслава?*

А) У Ноўгарадзе; Б) у Кіеве; В) у Полацку.

*9. У якім стагоддзі быў пабудаваны сабор у імя святой Сафіі ў Полацку?*

А) 9; Б) 10; В) 11; Г) 12.

*10. Пражыў князь Усяслаў Чарадзей больш за...*

А) 80 гадоў; Б) 70 гадоў; В) 57 гадоў.

Праверка правільнасці выканання тэсту.

— Вучні, якія сядзяць за адной партай, правяраюць па ключу правільнасць выканання тэста адзін у аднаго.

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Г | В | А | В | Б | Г | В | В | В | Б |

— Ацаніце працу свайго суседа.

**IV. Этап тлумачэння новага матэрыялу.**

**Паведамленне тэмы і задач урока.**

***Настаўнік:*** Прачытайце ланцужок з прозвішч і імён, успомніце, што вы ведаеце пра гэтых славутых людзей (***слайд 2***): *Францыск Скарына, Сымон*

*Будны, Еўфрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі.* Як вы лічыце, хто з іх лішні?

***Вучань:*** Кірыла Тураўскі, бо ён пісьменнік.

***Вучань:*** Я лічу, што Еўфрасіння Полацкая ў гэтым спіску лішняя, бо мы не ведаем, ці асветніца яна.

***Настаўнік:*** Адказ на гэта пытанне мы даведаемся ў канцы ўрока.

Сёння на ўроку размова пойдзе пра Еўфрасінню Полацкую (***слайд 3***). Якія задачы паставім? *(Мы даведаемся...)*

***Настаўнік:*** Так, сёння на ўроку мы працягнем падарожжа па мінулым нашай краіны, а дакладней — па 12 стагоддзі. Пазнаёмімся з выдатнай жанчынай нашай зямлі — Еўфрасінняй Полацкай, даведаемся, якую памяць яна пакінула аб сабе.

**Старонка першая. «Прадслава».**

***Настаўнік:*** Прыкладна ў 1104 годзе ў Полацку ў сям'і князя Святаслава-Георгія, малодшага сына Усяслава Чарадзея, і княгіні Сафіі нарадзілася дзяўчынка, якую назвалі старажытным крывіцкім імем Прадслава (***слайд 4***).

— Ці цікава вам, як прайшло дзяцінства Прадславы?

***Настаўнік:*** Зараз мы папрацуем у групах па 4 чалавекі. Групуемся па 2 парты, якія стаяць адна за адной. У кожнай групы на сталах ляжыць матэрыял пра дзяцінства Прадславы. Вам прапануецца прачытаць, выбраць самае галоўнае і расказаць класу.

***Тэкст для вучняў 1-й групы.***

Нянькі з маленства расказвалі Прадславе паданні пра Рагнеду, пра яе дзеда Усяслава Чарадзея. Яны расказвалі казкі, замовы, пелі абрадавыя песні. Прадслава вучылася ўсім сэрцам любіць сваю Радзіму.

***Тэкст для вучняў 2-й групы.***

Яе бацька, князь Святаслаў, запрасіў у дом манахаў, і яны навучылі дзяўчынку пісаць і чытаць, любіць кнігі. Настаўнікі не маглі нахваліцца сваёй здольнай выхаванкаю.

***Тэкст для вучняў 3-й групы.***

Падросшы, Прадслава часта хадзіла ў Сафійскі сабор. Ёй падабалася жыццё манашак. Бо ў саборах і манастырах захоўвалася шмат мудрых кніг, можна было спакойна займацца навукаю і шмат часу аддаваць малітве.

***Тэкст для вучняў 4-й групы.***

Далёка за межамі Полацкага княства ведалі аб мудрасці, розуме і прыгажосці Прадславы. А калі дзяўчыне споўнілася трохі больш за дзесяць год, да яе бацькі сталі прыязджаць сваты.

***Настаўнік:*** Што вы даведаліся пра маленства Прадславы? Папрацуем у парах: вучні, якія сядзяць на 1-м варыянце, распавядаюць сваім суседзям па парце, што самае важнае яны запомнілі з расказаў удзельнікаў груп 1 і 2; а вучні, якія сядзяць на 2-м варыянце, распавядаюць сваім суседзям па парце, што самае важнае яны запомнілі з расказаў удзельнікаў груп 3 і 4.

Кожная група прадстаўляе вынікі сваёй працы.

***Настаўнік:*** Калі дзяўчыне споўнілася трохі больш за дзесяць год, да яе бацькі сталі прыязджаць сваты. Унучка полацкага князя Усяслава Чарадзея прыгажуня Прадслава магла разлічваць на самага багатага і прыгожага жаніха. Але гэта яе зусім не вабіла. Ужо ў дванаццаць гадоў яна зразумела, што слава самых прыгожых і багатых жанчын заканчваецца разам з іх смерцю. А яна марыла застацца ў памяці людзей на вякі. У тайне ад бацькоў дзяўчына ўцякла ў манастыр і пастрыглася ў манахіні.

***Настаўнік:*** Што адзначае слова *манастыр*? Прачытайце тлумачэнні і пальцамі пакажыце правільны варыянт адказу (***слайд 5***).

**Манастыр — гэта...**

1) галоўная царква ў горадзе;

2) месца пражывання манахаў альбо манашак;

3) княжацкі палац.

**Старонка другая. «Манашка Еўфрасіння».**

***Настаўнік:*** У манастыр прыязджаў яе бацька, прасіў вярнуцца Прадславу дадому, але яна растлумачыла яму, чаму пайшла ў манастыр (***слайд 6***).

— Чаму Прадслава пайшла ў манастыр? Адказы прачытаем на с. 47 падручніка, першы абзац. *(Каб прысвяціць сваё жыццё Богу і бедным людзям.)*

***Настаўнік:*** Якое новае імя яна атрымала ў манастыры? ***(Слайд 7.)*** *(Еўфрасіння.)*

***Настаўнік:*** Імя Еўфрасіння ў перакладзе з грэчаскай мовы азначае «радасць».

Пасяліўшыся ў Сафійскім саборы, у маленькім пакойчыку — келлі, Еўфрасіння перапісвала кнігі (***слайд 8***).

Мы ўжо ведаем, якая гэта была нялёгкая праца. Перапісваннем кніг тады займаліся толькі мужчыны. Ужо толькі тое, што за такую цяжкую справу ўзялася жанчына, было подзвігам.

Еўфрасіння пісала і свае творы — малітвы і павучанні, а таксама перакладала з замежных моў. Частка перапісаных князёўнаю кніг ішла на продаж, а атрыманыя грошы раздавалі бедным.

У тыя далёкія часы школ яшчэ не было, як не было і падручнікаў. Дзяцей вучылі або бацькі, або ў манастырах і цэрквах. У адчыненых ёю школах, апрача чытання, пісьма і лічэння, дзеці вывучалі гісторыю, замежныя мовы. Найбольш здатных хлопчыкаў і дзяўчынак вучылі складаць вершы. Дзяўчынак вучылі рабіць розную хатнюю справу: шыць, вышываць, гатаваць ежу. Часта ўрокі праводзіла сама асветніца. Еўфрасіння хацела, каб у Полацкім княстве было як мага больш пісьменных людзей, і марыла пра тое, каб кнігі перапісвалі не адзінкі, а дзясяткі вучоных людзей.

За сваю дзейнасць Еўфрасіння атрымала ў народзе празванне Полацкая (***слайд 9***).

Усё жыццё Еўфрасіння служыла асвеце свайго народа.

***Настаўнік:*** Да чаго заклікала Еўфрасіння народ? Прачытайце самастойна другі абзац на с. 48 і даведайцеся пра гэта. *(Паважаць адзін аднаго, спыніць крывавыя войны, жыць у міры.)*

***Настаўнік:*** Зараз праверым, як вы ўважліва слухалі. Гульня *«Ці праўда, што...»*. Я назаву сцвярджэнні, калі яны правільныя, то падымайце руку, а калі не — прысядайце.

1. Еўфрасіння Полацкая жыла ў Кіеўскім княстве. *(Не.)*

2. Еўфрасіння хацела, каб у Полацкім княстве было як мага больш пісьменных людзей. *(Так.)*

3. Еўфрасіння Полацкая будавала дарогі. *(Не.)*

4. Еўфрасіння Полацкая перапісвала кнігі. *(Так.)*

5. Еўфрасіння Полацкая вучыла дзяўчынак пры манастыры. *(Так.)*

6. Еўфрасіння Полацкая кіравала дзяржавай. *(Не.)*

***Настаўнік:*** Так, Еўфрасіння хацела, каб у Полацкім княстве было як мага больш пісьменных людзей. Для выканання свайго жадання яна перапісвала кнігі, вучыла дзяўчынак пры манастыры.

***Фізкультхвілінка.***

Праводзіць адзін з вучняў класа.

**Старонка трэцяя. «Заснаванне манастыра».**

***Настаўнік.*** Была ў Еўфрасінні Полацкай незвычайная здольнасць: тыя, да каго звярталася яна са сваім святым словам, станавіліся такімі ж, як і яна: сумленнымі, добрымі, спагадлівымі, нераўнадушнымі да чужой бяды.

Старажытны рукапіс сведчыць, што аднойчы ноччу ў сне Еўфрасінні з'явіўся анёл і загадаў пабудаваць царкву на рацэ Палаце.

І дапамагаў ей у будаўніцтве храма майстар-архітэктар Іаан. Ён прынёс да яе цацачны будынак храма, які вельмі спадабаўся Еўфрасінні (***слайд 10***).

І пачалося будаўніцтва царквы, якая і сёння знаходзіцца ў Полацку, недалёка ад ракі Палаты, і носіць імя Спаса-Еўфрасіннеўская царква (***слайд 11***).

***Настаўнік:*** Давайце знойдзем размяшчэнне царквы на карце ў атласе, с. 8–9.

— У якім горадзе яна знаходзіцца? *(У Полацку.)*

**Старонка чацвёртая. «Святы Крыж».**

***Настаўнік:*** Асветніца заўсёды збірала вакол сябе таленавітых людзей (***слайд 12***). Мы ўжо ведаем пра майстра-архітэктара Іаана, а зараз даведаемся пра славутага майстра-ювеліра Лазара Богшу.

Для таго каб даведацца, які сімвал веры папрасіла зрабіць Еўфрасіння ў майстра-ювеліра Лазара Богшы, папрацуем у парах. Прачытайце ланцужком на с. 49 першы абзац.

***Настаўнік:*** Якая святыня ад Еўфрасінні засталася беларускаму народу? *(Крыж Еўфрасінні Полацкай.)* ***(Слайд 13.)***

***Настаўнік:*** Што здарылася са святым крыжам? *(Ён знік.)*

***Настаўнік:*** Сучасны брэсцкі майстар Мікалай Кузьміч вырашыў зрабіць дакладную копію Крыжа Еўфрасінні Полацкай. Праца доўжылася больш за пяць гадоў. А пошукі сапраўднага крыжа працягваюцца (***слайд 14***).

**Старонка пятая. «Святая».**

***Настаўнік:*** Што яшчэ вы хочаце даведацца пра Еўфрасінню Полацкую? ***(Слайд 15.)***

***Вучань:*** Як увекавечана памяць аб Еўфрасінні Полацкай?

***Вучань:*** Чаму царква абвясціла Еўфрасінню Полацкую святой?

***Настаўнік:*** Зараз працуем у групах. Кожная група чытае тэкст і рыхтуе адказ на сваё пытанне.

***Заданне для вучняў 1-й групы.***

• Што здарылася з Еўфрасінняй у Іерусаліме?

У канцы жыцця Еўфрасіння вырашыла адправіцца ў далёкае падарожжа ў Іерусалім, каб пакланіцца Святой Зямлі, дзе жыў Ісус Хрыстос. Там яна захварэла і памерла ў 1173 годзе. Пазней астанкі Еўфрасінні былі перавезены ў Полацк у Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр.

***Заданне для вучняў 2-й групы.***

• Чаму царква абвясціла Еўфрасінню Полацкую святой?

Еўфрасіння Полацкая зрабіла для нашага народа столькі дабра, што царква абвясціла яе святой. І зараз 5 чэрвеня штогод у Беларусі адзначаецца дзень памяці Еўфрасінні Полацкай. Яна лічыцца нябеснай заступніцай зямлі беларускай.

***Заданне для вучняў 3-й групы.***

• Кім для беларусаў з'яўляецца Еўфрасіння Полацкая?

Еўфрасіння Полацкая — наша гордасць і наша нябесная заступніца. Можа, дзякуючы ёй наш народ беларускі, нягледзячы на ўсе цяжкасці і выпрабаванні, што пасылае яму час, застаецца дружалюбным, міралюбівым, цярплівым і чулым да чужой бяды.

***Заданне для вучняў 4-й групы.***

• Як увекавечана памяць аб Еўфрасінні Полацкай?

У Полацку пастаўлены помнік Еўфрасінні Полацкай, ёсць вуліца Еўфрасінні Полацкай, якая цягнецца ад манастыра да Сафійскага сабора. Адна з гімназій горада Полацка носіць яе імя.

Удзельнікі кожнай групы па чарзе адказваюць на пытанні. Настаўнік адкрывае адпаведныя слайды (***16–24***).

***Настаўнік:*** Дзеці, як вы лічыце, ці можна Еўфрасінню назваць асветніцай? Чаму?

Вынік: Еўфрасіння Полацкая прысвяціла жыццё асвеце свайго народа.

**V. Этап замацавання ведаў і спосабаў дзейнасці.**

***Настаўнік:*** Прапаную вам праверыць свае веды і разгадаць крыжаванку.

***Пытанні.***

1. Будынак, дзе жывуць манахі.
2. Жанчына, якая жыве ў манастыры.
3. Імя знакамітай беларускай манашкі.
4. Імя гэтай манашкі пры нараджэнні.
5. Які статус надаў царкоўны ўлад Еўфрасінні?
6. Што заказала Еўфрасіння Полацкая ў Лазара Богшы?

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | М | | | | | |
| | 2 | М | А | Н | А | Ш | К | А | | |
| | | | | | Н | | | | | |
| 3 | Е | Ў | Ф | Р | А | С | І | Н | Н | Я |
| 4 | П | Р | А | Д | С | Л | А | В | А | |
| | 5 | С | В | Я | Т | А | Я | | | |
| | | 6 | К | Р | Ы | Ж | | | | |
| | | | | | Р | | | | | |

***Настаўнік:*** Якое галоўнае слова ў вас атрымалася?

***Вучань:*** Манастыр.

**VI. Этап паведамлення дамашняга задання.**

***Настаўнік:*** Дома вы яшчэ раз прачытаеце пра Еўфрасінню Полацкую ў падручніку (с. 46–50) і адкажыце на пытанні 1–4 пасля тэксту.

**VII. Этап падвядзення вынікаў урока, рэфлексія.**

***Настаўнік:*** Цяпер мы можам адказаць на пытанне, якое стаяла ў пачатку ўрока.

Хто лішні (***слайд 25***): Францыск Скарына, Сымон Будны, Еўфрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі?

***Вучань:*** Усе гэтая людзі — асветнікі, якія прысвяцілі сваё жыццё асвеце другіх людзей. Ніхто не лішні.

Настаўнік адкрывае ***слайды 26–28*** прэзентацыі.

***Настаўнік:*** І нам, беларусам, ёсць кім ганарыцца. Еўфрасіння паказвала прыклад іншым, як трэба жыць і самаадана служыць сваёй Бацькаўшчыне. Яна стала першай беларускай жанчынай, пра якую загаварыў увесь свет ***(слайд 29)***.

# Метадычны каментарый

На наш погляд, праведзены адкрыты ўрок па тэме «Еўфрасіння Полацкая» ў IV класе Л. С. Слівы заслугоўвае высокай ацэнкі.

Пры ажыццяўленні ***арганізацыйнага этапу ўрока*** настаўнік хутка праверыў гатоўнасць вучняў да ўрока, вывесіў на дошцы ілюстрацыі, якія раскрываюць змест верша, і правёў паэтычную хвілінку. Настаўнік падабраў прыгожы верш Яніны Жабко пра нашу Радзіму, які стварае пэўны настрой урока; удалая знаходка з апісаннем Беларусі прыметнікамі прыводзіць да ўстанаўлення міжпрадметных сувязей з беларускай мовай і літаратурным чытаннем і спрыяе развіццю маўлення малодшых школьнікаў.

Заслугоўвае асаблівай увагі, што настаўнік знаходзіць час пахваліць сваіх вучняў: «Малайцы! Вельмі прыемна слухаць такія пяшчотныя словы: наша Беларусь светлая, чыстая, белая; шматнацыянальная; працавітая, мудрая; утульная, міралюбівая, чароўная; добразычлівая, дружалюбная; з блакітнымі вачыма, пад белымі крыламі — гэта яшчэ раз сведчыць аб тым, што ўсе мы любім нашу краіну, нашу Радзіму».

***На этапе актуалізацыі суб'ектнага вопыту вучняў*** настаўнік праводзіць праверку дамашняга задання з выкарыстаннем тэста, а затым арганізуе парную працу навучэнцаў, якія сядзяць за адной партай, па праверцы правільнасці яго выканання па ключу і прапануе вучням ацаніць працу свайго суседа. Узаемаправерка дамашняга задання з'яўляецца эфектыўным спосабам фарміравання самаацэнкі малодшых школьнікаў.

***На этапе тлумачэння новага матэрыялу,*** выкарыстоўваючы метад «Чацвёрты лішні», паўтараючы вывучаных дзеячаў, настаўнік падводзіць вучняў да вызначэння тэмы ўрока; выкарыстоўвае розныя віды працы: франтальную, групавую, парную, індывідуальную; навучэнцы працуюць з рознымі крыніцамі: падручнік (аналіз тэксту), атлас; тэкст не падаецца цалкам, а разбіваецца на часткі; кожны этап працы з тэкстам адпрацоўваецца ў парах, рэфлексуецца, праводзіцца першасная праверка атрыманых ведаў; выкарыстоўваюцца гульнявыя формы «міжэтапнага» кантролю; мультымедыйная прэзентацыя візуалізуе атрыманыя веды; ажыццяўляецца праца са складанымі і незнаёмымі словамі; з дапамогай гульні «Ці праўда, што...» адбываецца праверка засвоенай вучнямі інфармацыі.

***На этапе замацавання ведаў і спосабаў дзейнасці*** настаўнік прапануе вучням праверыць засвоеныя веды праз разгадванне крыжаванкі.

Мэтазгодным з'яўляецца тое, што на кожным этапе ўрока настаўнік падводзіць вынікі працы.

***На этапе падвядзення вынікаў урока, рэфлексіі*** настаўнік выкарыстаў прыём вяртання да пачатку ўрока — метад «Чацвёрты лішні».

Своечасова была праведзена фізкультхвілінка, якую з вялікім задавальненнем правёў адзін з вучняў.

У працэсе ўрока вучні атрымалі:

✓ сістэму ведаў аб жыцці і дзейнасці Еўфрасінні Полацкай, а таксама пра значэнне яе дзейнасці для беларускай гісторыі;

✓ вопыт спосабаў дзейнасці: аналіз гістарычных тэкстаў, праца з падручнікам, праца з атласам;

✓ вопыт творчай дзейнасці: рашэнне крыжаванкі;

✓ вопыт каштоўнаснага стаўлення да свету: праз выхаванне павагі да культуры і гісторыі Беларусі, а таксама праз пачуццё гонару за беларускіх асветнікаў.

Выкарыстанне на ўроку эфектыўных форм, метадаў і прыёмаў, неабходнага дэманстрацыйнага і раздатачнага матэрыялу дазволіла Л. С. Сліве:

✓ арганізаваць адукацыйны працэс з улікам узроставых і індывідуальных асаблівасцей вучняў IV класа;

✓ стварыць камфортную атмасферу на ўроку для кожнага вучня і ўмовы, пры якіх большую частку ўрока вучні самастойна выконвалі прапанаваныя настаўнікам заданні, працуючы ў парах і групах;

✓ пазнаёміць вучняў з біяграфічнымі звесткамі Еўфрасінні Полацкай; паказаць вялікую гуманістычную ролю яе служэння сваёй Бацькаўшчыне;

✓ садзейнічаць развіццю ў вучняў аналітычных і камунікатыўных здольнасцей, навыкаў групавога ўзаемадзеяння, уменняў самакантролю, самаправеркі, самаацэнкі;

✓ садзейнічаць выхаванню высокіх маральных якасцей, павагі да гісторыі і культуры Беларусі.